Значная падзея

МАНЮШКА І МАЛЕНЬКІ ПАРЫЖ

На тры дні старажытны Нясвіж ператварыўся ў адну вялікую сцэнічную пляцоўку падчас Свята мастацтваў «Музы Нясвіжа-2019». Шмат эмоцый, уражанняў падаравалі арганізатары фестывалю — Міністэрства культуры Беларусі, Мінскі аблвыканкам, Нясвіжскі райвыканкам і Заслужаны калектыў «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі» жыхарам горада, шматлікім гасцям, прыхільнікам камернай музыкі.

Па традыцыі ў першы дзень нясвіжскай імпрэзы Заслужаны аматарскі калектыў Беларусі тэатра імя Уршулі Радзівіл Нясвіжскага раённага цэнтра культуры паказаў камедыю па п'есе Жана-Батыста Мальера «Ён мужык, а яна паненка» ў пастаноўцы рэжысёра Яўгена Валабоева.

На працягу 24 гадоў мастацкія фэсты ў Нясвіжы застаюцца адной з самых адметных падзей у культурным жыцці Беларусі. Штогод гэтыя інавацыйныя праекты яднаюць айчынную музыку розных эпох і жанраў. З моманту свайго заснавання і да сённяшняга дня фестываль з'яўляецца сімвалам узнаўлення і адраджэння гісторыі беларускага мастацтва, перш за ўсё — музычнага.

Сёлетняе свята было прысвечана 200-годдзю вядомага кампазітара Станіслава Манюшкі. Таму своеасаблівым прынашэннем юбіляру ад усіх аматараў і знаўцаў яго творчасці стаў вялікі канцэрт акадэмічнай музыкі «Нясвіж — крыніца натхнення Станіслава Манюшкі і яго аднадумцаў», падрыхтаваны творчымі калектывамі Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга.

— Мы першыя ў Беларусі ў мястэчку Мір некалькі гадоў таму арганізавалі канцэрт у знак пашаны да гэтага аўтара. Раней многія лічылі, што Манюшка — польскі кампазітар. Але ў Польшчы ён пражыў толькі пятнаццаць гадоў, астатнія — у Беларусі. Цяпер зноў загучала імя гэтага кампазітара, ураджэнца Міншчыны, а я — ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці, таму не мог не ўспомніць гэтую знамянальную дату. Я сам стаў цяпер больш ведаць пра яго творчасць. І мы абавязкова зробім новую вялікую праграму, прысвечаную таленавітаму творцу. Заўчасна не скажу, калі гэта будзе, але, бадай, праз год або два.

Міхаіл Фінберг падкрэсліў, што фестываль стаў па-сапраўднаму нацыянальным, беларускім.

Тут жа, у Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, перад пачаткам прэс-канферэнцыі наведвальнікі змаглі азнаёміцца з невялікай выстаўкай, якая расказвала пра творчасць маэстра, паслухаць выступленне струннага квартэта і ансамбля кларнетыстаў. Але самае цікавае і яркае чакала аматараў камернай музыкі пасля. Творчыя калектывы Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі прадставілі для іх свае новыя канцэртныя праграмы, дзе прагучалі найлепшыя ўзоры беларускай музыкі з XII да XXI стагоддзя. Канцэрт «Рэлігійныя творы айчынных майстроў» сабраў удзельнікаў і гасцей свята ў Нясвіжскім Касцёле Божага Цела, канцэрт «Музыка беларускіх палацаў» — у Тэатральнай зале Палацавага ансамбля Нясвіжа.

Даволі шмат людзей розных узростаў сабраліся ў Нясвіжскім цэнтры культуры. Яны прыйшлі, каб прыняць удзел у адкрыцці выстаўкі работ з фонду Міжнароднага конкурсу-пленэру юных мастакоў імя Міхаіла Сеўрука «Краявіды Нясвіжа вачыма дзяцей».

— Адзінаццаты год мы праводзім пленэр для дзяцей. Кожны раз ён прысвечаны розным тэмам, каб дзецям было цікавей працаваць, — расказала **загадчыца мастацкім аддзяленнем Нясвіжскай дзіцячай школы мастацтваў Марына КАНАВАЛАВА.** — Мы робім кампазіцыйны пейзаж асобна, а яшчэ пішам два эцюды з натуры. Сёння на выстаўцы ў асноўным прадстаўлены карціны 2019 года. Гэта работы прызёраў, якія атрымалі дыпломы 1-й і 2-й ступеняў і Гран-пры. Сёлета дзеці малявалі на тэму «Нясвіж. Французскія паркі». Юным талентам трэба было ўявіць, як калісьці яны выглядалі, праявіць фантазію. Таму кампазіцыі атрымаліся незвычайнымі, фантастычнымі. І, даецца на першы погляд, намаляваныя краявіды не маюць адносін да Нясвіжа. Але гэтыя паркі сапраўды калісьці існавалі і дзеці перадалі іх прыгажосць. У пленэры ўдзельнічалі школьнікі не толькі з Мінскай вобласці, але і з розных куткоў Беларусі, а таксама з горада Рэутава Маскоўскай вобласці і Літвы.

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Святлана БАРАНОК яшчэ раз нагадала, што творчасць Станіслава Манюшкі вядомая не толькі ў Беларусі і Польшчы. Сёлета ўвесь свет адзначае 200-годдзе з дня нараджэння беларуска-польскага кампазітара, які нарадзіўся на Міншчыне ў мястэчку Убель Чэрвеньскага раёна.

— Самае галоўнае, чым мы можам ганарыцца, гэта тое, што ў Смілавічах адкрылі музейную экспазіцыю, якая знаёміць з яго жыццём і творчасцю. Гэта адзіны ў свеце музей Манюшкі. І сёння наш фестываль ажывіў музыку не толькі гэтага выдатнага творцы, але і кампазітараў, якія жылі ў яго эпоху, — адзначыла Святлана Баранок.

Як падкрэсліла Святлана Аляксандраўна, на Міншчыне праводзіцца каля дваццаці культуралагічных акцый. А наогул, калі казаць пра мерапрыемствы, то ўсяго іх трыццаць восем. Некаторыя з іх ладзяцца з перыядычнасцю раз на два гады, іншыя — раз на тры гады. Вясна, май — самая фестывальная пара года. У Вілейцы, Маладзечне, Мядзеле прайшоў фестываль духавой музыкі «Майскі вальс», які сабраў духавыя аркестры з Міншчыны, Беларусі, замежных краін. У пачатку чэрвеня Маладзечна прыме Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі.

Завяршылася музычная акцыя 25 мая вялікім гала-канцэртам «Новае ў Нясвіжы», дзе разам з канцэртным аркестрам выступі лаўрэаты міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў Наталля Тамела, Таццяна Глазунова, Галіна Грамовіч, Алеся Дзержавец, Дзмітрый Качароўскі і іншыя.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Фота Андрэя САЗОНАВА.

Спытайце пра радзіннае

Што лепш: даваць ці браць?

На шматлікіх сустрэчах нам задаюць падобныя пытанні: «Што рабіць, калі мая суседка пастаянна прыходзіць у нядзелю або ў свята і што-небудзь просіць? А пасля таго як яна што-небудзь возьме, я абавязкова кепска сябе адчуваю»; «Ужо не раз заўважаю, у нядзелю ідзе суседка, каб што-небудзь пазычыць. У гэты дзень абавязкова пасварыся з мужам».

Па-першае, ніколі ў такім выпадку не давайце тое, што папрасілі, з рук у рукі — пакладзіце на стол і паназірайце за паводзінамі суседкі: калі возьме і пойдзе, ведайце — нічога кепскага яна вам зрабіць не хацела, проста гэта гаспадыня крыху неарганізаваная. Калі ж пачне выкручвацца і рабіць так, каб вы перадалі рэч з рук у рукі, — чалавек прыходзіць у хату з кепскімі думкамі.

Зразумела, што ў гэтым выпадку галоўнай умовай з'яўляецца тое, што абодва чалавекі з'яўляюцца прадстаўнікамі адной і той жа рэгіянальнай традыцыі. У нашым выпадку мы бачым, што суседка ідзе на наўмыснае парушэнне (падтэксты гэтага жадання могуць быць розныя: спецыяльна справакаваныя або зусім незласлівыя — сапраўды дома не засталося хлеба). У такім разе гаспадыня хаты, да якой прыйшлі па пазыку, запускала механізм процідзеяння, скіраваны на захаванне далейшага гарманічнага існавання сваёй сям'і. Яна імкнулася перасцерагчы сябе і гаспадарку ад магчымага негатыўнага ўздзеяння. Напрыклад, каб не наклікаць на сваю сям'ю бяды і непрыемнасцяў, ведалі, што, калі вы частуеце чужога чалавека, вандроўніка ці суседа малаком, у збан неабходна пакласці драбінку солі. Нездарма казалі: «Соль таму ў вочы, хто дабра нам не хоча».

Сацыякультурная інтэнцыя «даваць — браць» ахоплівае практычна ўсе бакі зносін паміж людзьмі. Лічылася, што, перадаючы тую ці іншую рэч, можна перадаць (аддаць) і адпаведна атрымаць і іншыя «каштоўнасці» (сямейны дабрабыт, «спор» або ўрадлівасць зямлі ці плоднасць свойскай жывёлы, асабісты поспех, чалавечае шчасце). Таму ў кодэксе нормаў побытавага этыкету і звычаёвага права нашага народа існаваў шэраг правіл, якіх неабходна было прытрымлівацца падчас працэдуры перадачы: калі вы пазычаеце што-небудзь, дорыце ці атрымліваеце тыя ці іншыя рэчы, грошы і г. д.

Цэлы шэраг рэгламентацый, звязаных з дылемай «браць — аддаваць», датычыліся таго перыяду часу, калі пачыналіся (не аддавай расаду капусты, пакуль сам не пасадзіў) і заканчваліся сельскагаспадарчыя работы: ураджай і рост раслін адыдзе да таго, хто браў тыя ці іншыя рэчы.

✓ Ніколі не аддавалі нічога і не пазычалі ў той дзень, калі з дому ад'язджаў хто-небудзь са сваякоў. Лічылася, што выкананне гэтай забароны будзе спрыяць добраму шляху і вяртанню дадому таго, хто знаходзіўся ў вандроўцы.

✓ Першыя тры дні пасля нараджэння дзіцяці надзяляліся асаблівай сакральнасцю. Лічылася, што калі ў гэтыя дні штосьці пазычыць ці аддаць з хаты, то дзіця «будзе цурацца роднай хаты», то-бок, будзе вандроўнікам, «перакаціполем».

✓ Ніколі не пазычалі і не аддавалі што-небудзь у панядзелак. Меркавалі, што ў такім выпадку ўвесь тыдзень «пойдзе прахам». Калі аддавалі з хаты прадукты харчавання, напрыклад, хлеб, малако, муку, цукар, сачылі, каб не аддаць апошняе, інакш сам застанешся без усяго. Ніколі не аддавалі малако з хаты ў дзень першага выгану жывёлы ў поле. Хлеб, як і іншыя прадукты ці рэчы, ніколі не перадавалі праз парог, каб з хаты не пайшоў дабрабыт.

✓ Асаблівай сакральнасцю надзялялі полымя. Таму ў некаторых славянскіх народаў існавала строгая забарона: ні пры якіх умовах не аддаваць з хаты агонь. Лічылася: калі вы выносіце з хаты полымя (святло), хату пакідае шчасце.

✓ Пчаляры ніколі не частавалі мёдам хворых людзей, таму што былі перакананы, што пчолы захварэюць і прападуць. Мёд для хворага чалавека трэба было даваць праз трэція рукі.

✓ На Беларусі былі ўпэўнены ў тым, што ў той момант, калі ў хаце знаходзіцца нябожчык, з яе нельга нічога браць, выносіць і г. д., таму што «перанясеш» смерць у сваю хату. У дні ўшанавання продкаў, наадварот, неабходна было раздаваць прадукты харчавання, рэчы, грошы. Існавала строгае правіла: міласціну давалі пры ўваходзе на могілкі (як і, дарэчы, у храм), пры выхадзе з могілак — ніколі!

✓ І сёння ў народзе існуе няпісанае правіла не адмаўляць у просьбе перадачы якіх-небудзь рэчаў, прадуктаў харчавання цяжарнай жанчыне. Расказваюць, што калі ёй адмовіць, хату «апануюць» пацукі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Фестывалім

«МАГУТНЫ БОЖА» ПРАСПЯВАЎ ГІМН СЯМ'І

Міжнародны фестываль духоўнай музыкі запомніўся магіляўчанам узнёслай музыкай, лірычнымі вулічнымі канцэртамі, святам для дзяцей «Шчырае сэрца», праваслаўнай выстаўкай-кірмашом і лячэбным звонам.

Форум праводзіўся ў Магілёве ўжо дваццаць трэці раз. Калі параўноўваць папярэднія фестывалі і гэты, робіцца відавочна, што ён усё больш набывае статус сямейнага. На канцэрты, што адбыліся на адкрытых і закрытых пляцоўках, гледачы прыходзілі сем'ямі, шмат хлопчыкаў і дзяўчынак было на дзіцячым дабрачынным святе ў Падмікольскім парку, іх звонкія галасы звінелі на дзіцячай пляцоўцы каля дыягнастычнага цэнтра, дзе працавала духоўна-асветніцкая выстаўка-кірмаш.

«Адно аднаго захоўвайце ва ўсе часы, / Жывіце ў ладзе і гармоніі», — спявалі ўдзельнікі канцэрта «Гімн сям'і» падчас гала-канцэрта на стадыёне «Спартак».

Фестываль у фестывалі. І сям'я на першым плане

Яно і лагічна, бо сям'я — гэта самае духоўнае і каштоўнае, што ёсць у жыцці чалавека. Не дзіўна, што на дзіцячай пляцоўцы Свята-Елісавецінскага манастыра, дзе ўсе фестывальныя дні паказвалі батлеечныя спектаклі, вучылі рабіць папяровых галубоў і размалёўваць велікодныя яйкі, штодзённа прысутнічала не менш за дзвесце дзяцей. І гэта па падліках Ірыны, прадстаўніцы манастыра, якая непасрэдна займалася арганізацыяй вольнага часу юных наведвальнікаў. Манастыр прыехаў на фестываль са сваім адмысловым фестывалем — «Радасць». Тут працавала некалькі дзіцячых гасціных і зон, дзе праводзіліся майстар-класы, гульнявая для маленькіх дзяцей. Малыя з задавальненнем глядзелі батлеечныя спектаклі на пакладзеных перад «сцэнай» пуфіках. А старэйшым і нават бацькам было цікава навучыцца азам крылічнай вязі.

Кнігі, іконы, жаночыя ўпрыгожанні, адзенне, дзіцячыя настольныя гульні і цацкі ды нават манастырскі хлеб — у гандлёвых радах праваслаўнай выстаўкі-кірмашы можна было набыць усё, што пажадаеш. І адначасова заказаць малебен або саракавуст — у Магілёў прыехалі шматлікія прадстаўнікі беларускіх епархій і прыходаў, а таксама манастыроў і храмаў з Расіі, Украіны, Грэцыі і Прыднястроўя.

Шмат было ахвотных заказаць царкоўныя трэбы ў расійскіх і ўкраінскіх манастырах і прыходах, бо яны прапаноўвалі, напрыклад, саракавусты ўсяго за два рублі. У Магілёве такая служба каштуе мінімум пяць рублёў.

Падтрымаць храмы можна было і ўзносам на імянную цаглінку. Традыцыя будаваць храмы ўсім светам існавала яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы. Зараз гэта робіцца ўсё больш актуальным. Цаглінка каштавала мінімум 50 капеек.

Спевы дацямна

Наогул у Магілёў на Міжнародны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа» прыехала больш за тысячу гасцей і ўдзельнікаў, ён аб'яднаў прадстаўнікоў трох канфесій — праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай з 14 краін свету.

Кожны вечар з 18.00 да 22.00 гараджан і гасцей віталі на плошчы Зорак хрысціянскія гурты, вакальныя і інструментальныя ансамблі, салісты з Беларусі, Латвіі, Фінляндыі, Расіі, Ізраіля, Аўстрыі, Швейцарыі, Эстоніі. Тут на адкрытай пляцоўцы праходзілі фестывальныя канцэртныя праграмы «Святло жыцця». Саліст легендарных «Песняроў» Валерый Скаражонак парадаваў шыкоўным выкананнем «Белавежскай пушчы». Яна, дарэчы, у рэпертуары ансамбля, які сёлета адзначае сваё паўстагоддзе, была адной з першых.

Арыядна Косціна прыехала на фестываль з Латвіі. У Рызе яна працуе выкладчыкам англійскай мовы, вучыць дзяцей з аслабленым слыхам, а паралельна займаецца з выхаванцамі дзіцячага крызіснага цэнтра. У жыцці ёй самой давялося прайсці праз цяжкія выпрабаванні. Яна са шматдзетнай сям'і, дзе маці няшмат увагі ўдзяляла дзецям. У дзяцінстве Арыядна збірала ў пераходзе міласціну, пакуль аднойчы нейкая незнаёмая жанчына не паспачувала ёй. Яна завяла дзяўчынку ў царкву, дзе дзіця накармілі і супакоілі. Вера змяніла яе погляд на жыццё, зрабіла яго больш насычаным і змястоўным. А талент спяваць, лічыць яна, у яе цалкам ад Бога. Спецыяльна гэтаму яна нідзе не вучылася.

Свята для дзяцей

Арганізатарамі дабрачыннага мерапрыемства «Шчырае сэрца» выступілі Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт, дзіцячы Фонд міру і Магілёўскі спецыялізаваны Дом дзіцяці.

— Свята дало ўсім нам магчымасць адчуць сябе камфортна і ўтульна, падняць настрой і паглядзець на гэты свет з пазітывам, — адзначыла **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вольга ПЕТРАШОВА.**

Установы адукацыі падрыхтавалі для «асаблівых» дзяцей харэаграфічныя, танцавальныя і вакальныя нумары. У Падміколлі працавала адначасова некалькі пляцовак, дзе юныя артысты маглі прадэманстраваць свае здольнасці. Для выхаванцаў Дома дзіцяці мерапрыемства стала сапраўдным падарункам. Яны ўдзельнічалі ў гульнях, майстар-класах, рабілі карцінкі з пяску ды дарылі гасцям і спонсарам. А магілёўскія прадпрыемствы частавалі іх смачнымі ласункамі.

І дзве тысячы долараў у падарунак

Асноўная частка бюджэту фестывалю «Магутны Божа» — гэта менавіта тыя грошы, якія атрыманы з продажу білетаў. Але арганізатары імкнуцца зрабіць фестываль даступным як мага большай колькасці людзей. Гэтым разам платнымі былі толькі чатыры канцэрты, якія прайшлі ў сценах Палаца культуры вобласці і на стадыёне «Спартак». Кошт білетаў складаў ад 25 да 45 рублёў.

Пляцоўка касцёла Успення Панны Марыі і Святога Станіслава па традыцыі з'яўляецца месцам правядзення любімых магіляўчанамі арганных канцэртаў. Яны бясплатныя, але гэтым разам была магчымасць зрабіць унёсак у аднаўленне цудоўнага помніка архітэктуры XVIII стагоддзя і ахвяраваць пэўную суму. Для гэтага на ўваходзе стаялі спецыяльныя скрыні.

У касцёле адбыліся і ўсе праслухоўванні міжнароднага конкурсу харавых і вакальных калектываў. Акустыка будынка і талент выканаўцаў дарылі выпадковым слухачам сапраўдную асалоду.

Старшыня журы конкурсу, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, прафесар Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя Пятра Чайкоўскага Станіслаў КАЛІНІН адзначыў: «Спевы — гэта душа народа. З песняй чалавек нараджаецца, з ёй сыходзіць з жыцця. На гэтым стаяла і стаіць нацыянальная культура, бо гэта, мабыць, самае дэмакратычнае мастацтва. Спеваку не патрэбны музычны інструмент, у яго ёсць тое, што яму даў Гасподзь Бог і бацькі. Харавая справа павінна трымацца на вельмі спрыяльнай гістарычнай глебе. Радасна, што якраз гэта і адбываецца ў Магілёве. Ваш горад прыцягвае да сябе многіх падзвіжнікаў харавой справы».

У склад журы сёлета ўвайшлі старшыня праўлення Беларускай асацыяцыі харавых дырыжораў Інэса Бадзяка і мастацкі кіраўнік і дырыжор хораў «Bel Canto», «Cantare», «Вільнюс» Артурас Дамбраўскас. Гран-пры XXIII Міжнароднага конкурсу духоўнай музыкі «Магутны Божа — 2019» здабыў хор студэнтаў магілёўскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, мастацкім кіраўніком і дырыжорам якога з'яўляецца Ірына Пякарская. Дарэчы, як адзначалася на прэс-канферэнцыі, пераможцу ў гэтым выпадку будзе перададзена дзве тысячы долараў у якасці падарунка.

Дыпломамі першай ступені адзначаны ансамбль «Cantus firmus» з Бранска ў намінацыі «Акадэмічныя вакальныя ансамблі» і Бранскі гарадскі акадэмічны хор у намінацыі «Акадэмічныя хары». Дыпломы другой і трэцяй ступені атрымаў шэраг дзіцячых акадэмічных хароў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота БелТА.

«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.

Грант на інфраструктуру

Праект «Глуша Адамовіча» быў падтрыманы на конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend

Пасёлак Глуша Бабруйскага раёна хутка стане яшчэ больш адамовіцкім. Акрамя таго што тут ужо ёсць прыпынак Адамовіча, у рабоце — помнік класіку, які плануецца ўсталяваць каля мясцовага Дома культуры ўвосень. А нядаўна фінансаванне атрымаў яшчэ адзін праект, звязаны з імем беларускага пісьменніка. Ён прадугледжвае стварэнне турыстычнай інфраструктуры — інфармацыйных стэндаў і паказальнікаў, а таксама інтэрактыўнага маршруту па творах Адамовіча. Праект быў прадстаўлены бабруйскай ініцыятыўнай групай «Прыпынак Адамовіча» на конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend.

— Усяго на трынаццаты сезон конкурсу паступіла 383 заяўкі з розных куткоў краіны. Удзельнікі прайшлі розныя этапы адбору, у тым ліку «народнае галасаванне». Яно працягвалася пяць дзён, — расказвае падрабязнасці **ідэйны натхняльнік і кіраўнік ініцыятыўнай групы ў Бабруйску «Прыпынак Адамовіча» Андрусь АРХІПЕНКА.** — Увесь гэты час мы знаходзіліся ў топ-20. За пяць дзён набралі 513 галасоў. Апошні дзень быў самым хвалюючым. Мы ўпэўнена ўваходзілі ў дваццатку наймацнейшых, а тут нечакана апынуліся за яе межамі. Нават засумавалі, бо ўжо выкарысталі ўсё магчымае, каб прыцягнуць увагу да праекта. Але вечарам сітуацыя кардынальна змянілася, мы былі ўжо на 16-м месцы — за шэсць гадзін набралі больш за 100 галасоў. Гэта быў сапраўдны цуд.

Фінал конкурсу праходзіў у гатэлі «Пекін», што ў Мінску. Падчас прэзентацыі свайго праекта бабруйчане прадэманстравалі эскіз бюста пісьменніка, які з'явіцца на яго малой радзіме, і дыплом фіналістаў конкурсу Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі камітэт Міжнароднага савета па захаванні помнікаў і славутых месцаў» (ІКАМОС) «Спадчына ў дзеянні». Гэта яшчэ адзін конкурс, праз які прайшлі бабруйчане. На ім было прадстаўлена каля 40 праектаў, і «адамовіцкі» трапіў у васьмёрку наймацнейшых. На жаль, перамагчы не атрымалася. Затое гэтым разам фартуна ўсміхнулася і дала шанц.

— Нас падтрымаў «Беларусбанк», ён гатовы выдзеліць для рэалізацыі праекта 10 тысяч рублёў. Плюс тысячу рублёў перадалі ад імя беларускага бізнесмена Віталя Князева, — паведаміў Андрусь.

— Чаму падтрымалі? — здзівіўся нашаму пытанню **начальнік упраўлення інфармацыі і сацразвіцця ААТ «Беларусбанк» Дзмітрый БАКІНОЎСКІ.** — Тут усё проста і відавочна. «Беларусбанк» — гэта вельмі сацыяльна адказная кампанія, якая рэалізуе вялікую колькасць розных сацыяльных праектаў па такіх асноўных кірунках, як спорт, культура, адукацыя, ахова здароўя і гэтак далей. У нас дзейнічае свая палітыка ў галіне сацыяльнай карпаратыўнай адказнасці. A Social Weekend — гэта буйная пляцоўка, якая збірае яскравых таленавітых людзей з вельмі цікавымі праектамі, накіраванымі на вырашэнне сацыяльных пытанняў. І банк не мог у гэтым не паўдзельнічаць. Улічваючы, што зараз у нас Год малой радзімы, мы вырашылі заявіць сваю намінацыю з аднайменнай назвай. У фінале быў шэраг годных праектаў, але найлепшым, на наш погляд, аказаўся праект, які цалкам адпавядаў нашай намінацыі. Глуша — гэта маленькі населены пункт са сваёй цікавай гісторыяй. Тым больш што Алесь Адамовіч — адзін з самых буйных, але крыху ў апошні час забытых пісьменнікаў. Таму мы і вырашылі падтрымаць ініцыятыву, каб і далей развіваць гэты праект, зрабіць з пасёлка цікавы брэнд і папулярызаваць нашу культуру, літаратуру.

З перамогай бабруйчан павіншавала **старшыня Глушанскага сельсавета Марыя СУШЧАНКА.** Яна лічыць, што з такой ініцыятыўнай моладдзю музей Адамовіча ў Глушы будзе абавязкова. А Наталля Адамовіч — дачка класіка — наогул была на фінале Social Weekend і асабіста падтрымлівала бабруйскіх актывістаў у гэты вырашальны момант.

На працягу паўгода праект павінен быць рэалізаваны.

— Будзем рабіць эскізы інфармацыйных стэндаў, узгадняць з мясцовымі ўладамі і пакрысе рэалізоўваць гэты праект, — кажа Андрусь. — Паступова дойдзем і да будынка аптэкі, дзе плануецца адкрыць музей. Шукаем магчымасць стварыць грамадскую арганізацыю.

Адамовіцкія праекты гэтым не завяршаюцца. Нагадаем, што працягваецца конкурс буктрэйлераў пад назвай «Ідзі і чытай», удзельнікам якога прапануецца зняць невялікі ролік працягласцю не болей за чатыры хвіліны на адзін з твораў Алеся Адамовіча. Пераможцы будуць вызначаны ў трох намінацыях: «Лепшы сцэнарый, ідэя буктрэйлера» , «Лепшая відэааператарская работа і мантаж» і Гран-пры за лепшы сцэнарый і тэхнічнае выкананне. Работы прымаюцца да 15 ліпеня. Інфармацыя на сайце — adamovich.by. Узнагароджанні пераможцаў і адкрыты прагляд буктрэйлераў адбудуцца ў верасні.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Збор сродкаў на музей працягваецца. Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Разліковы рахунак існуе пры **аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама р/р BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

Прызначэнне плацяжу — «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.